# «ДАВАЙЦЕ ШЧЫРА ПАГАВОРЫМ…»



Не памылюся, калі скажу, што старшага выкладчыка кафедры нямецкай філалогіі нашай ВНУ У.А. Папковіча ведаюць далёка за межамі роднай Беларусі. Ведаюць не толькі як вопытнага педагога, але і як таленавітага і самабытнага паэта, прафесійнага перакладчыка з нямецкай мовы.

Аптыміст па жыцці, Уладзімір Антонавіч роўна пяцьдзясят год таму з сям'ёй пераехаў з Мінска ў Віцебск і «прырос» да Прыдзвінскай зямлі. Пазнаёміўся з добрымі і шчырымі людзьмі, якія сталі для яго сапраўднымі сябрамі.

Пра гэта і шмат пра што іншае расказваў Уладзімір Папковіч падчас творчай вечарыны, якая праходзіла ў абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна напрыканцы сакавіка і была прымеркавана да дня нараджэння і 50-годдзя жыцця паэта ў Віцебску.

Вёў імпрэзу сам імяніннік: то сур'ёзна, то з гумарам чытаў вершы, распавядаў пра цікавыя гісторыі са свайго жыцця. Прысутныя слухалі з вялікім задавальненнем не толькі Уладзіміра Антонавіча, але і яго сяброў, у тым ліку літаратараў. А іх у той вечар прыйшло нямала. Кожны гаварыў пра свае шчырыя адносіны да У.А. Папковіча, даваў высокую ацэнку яго творчасці. Напрыклад, Сяргей Рублеўскі ахарактарызаваў свайго сябра як добразычлівага, адкрытага і вясёлага чалавека.

Хоць і доўжылася імпрэза каля дзвюх гадзін, прайшла яна на адным дыханні і цалкам апраўдала сваю назву «Давайце шчыра пагаворым…».

**Дзіяна ЛОСЬ,**
**студэнтка 5 курса ФлФ.**

**На здымку:** У.А. Папковіч.
**Фота Фёдара ГРЫНЕЎСКАГА.**

**Уладзімір ПАПКОВІЧ**

## РАДАСЦЬ ЖЫЦЦЯ

*Цудоўны дзень! І ты яшчэ жывы.*
*З-за хмары сонца восеньскае свеціць.*
*Дурныя думкі выкінь з галавы,*
*Імкніся ў людзях дабрыню прыкмеціць.*

*Глянь, колькі ў гэтым свеце пекнаты,*
*Вакол цябе: уверсе, знізу, збоку…*
*Няхай не ў цэнтры апынуўся ты,*
*Затое ў Госпада – навідавоку…*

*Ты адказала мне адмоўна*
*Ледзь чутным сарамлівым «не»,*
*Але вачэй тваіх дзве поўні*
*Уладна вабілі мяне.*

*І рукі гнуткія, як лозы,*
*Мяне прывязвалі крапчэй,*
*Я асцярожна выцер слёзы*
*З тваіх разгубленых вачэй.*

*Світанак радасна-суцішны*
*Ужо з-за лесу паўставаў.*
*Я цалаваў цябе — як вішні*
*У спёку летнюю ірваў.*